Дзяржаўная ўстанова культуры
"Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна"
*Цэнтральная раённая бібліятэка*

*Серыя «Героі Савецкага Саюза – вызваліцелі Асіповіцкага раёна»*

# У ПАМЯЦІ НАШАЙ ГЕРОІ ЖЫВЫЯ



## ШАРКОЎ Валянцін Івановіч

# Шаркоў
# Валянцін Іванавіч

**(4.09.1923- 28.04.1983)**

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**Нарадзіўся 4 верасня 1923 года ў горадзе Угліч (Яраслаўская вобласць). У 1924 годзе разам з бацькамі пераехаў у Маскву. Скончыў 10 класаўсярэдняй школы. Працаваў вучнем механіка-зборшчыка на заводзе "Геафізіка", адначасов азаймаўся ў аэраклубе Дзяржынскага раёна сталіцы.**

**З лістапада 1940 года ў Чырвонай Арміі. У кастрычніку 1942 года скончыў Энгельскую ваенную авіяцыйную школу лётчыкаў. Прымаў удзел у баях на Бранскім, Цэнтральным, Беларускім і 1-м Беларускім франтах. Быў лётчыкам, камандзірам звяна, намеснікам камандзіра эскадрыллі.**

**Баявы шлях Валянціна Шаркова пачаўся ў кастрычніку 1942 года.Валянцін Шаркоў хутка**

асвоіўся з баявой становішчам,усе заданні выконваў хутка і ўпэўнена. Ужо праз 4 месяцы быў узнагароджаны баявым ордэнам за 11 паспяховых вылетаў і знішчэнне жывой сілы праціўніка і баявой тэхнікі.

Да студзеня 1943 года ваяваў у складзе 614-га штурмавога авіяцыйнага палка, затым - 218-га штурмавога авіяцыйнага палка. Быў лётчыкам, камандзірам звяна, намеснікам камандзіра эскадрыллі.

У канцы лютага 1943 года група штурмавікоў, у складзе якой знаходзіўся і Шаркоў, вылецела на штурмоўку пярэдняга краю абароны гітлераўцаў у раёне Мцэнска. Але ў ходзе палёту яны былі перанацэлены на танкавую калону, якая рухалася па шашы з Карачава да Арла. Шаркоў адным з першых абрынуў на калону бомбы, рэактыўныя снарады і гарматна-кулямётны агонь. Шэсць заходаў здзейснілі лётчыкі. Ад многіх фашысцкіх танкаў і аўтамашын засталася толькі куча зламанага металу. На зваротным шляху Іл-2 на замыкальнага Шаркова напала пара знішчальнікаў ФВ-190 і адсекла яго ад іншых штурмавікоў. Прыйшлося лётчыку са сваім стралком весці няроўны бой, выконваць розныя тактычныя прыёмы. У выніку пашкоджаны Іл-2 Шаркову ўдалося пасадзіць на сваёй тэрыторыі, а ў ходзе бою стралок збіў аднаго “фокера”.

**Падчас бітвы на Курскай дузе лейтэнант Шаркоў ўжо камандаваў звяном. 14 ліпеня 1943 года экіпажу Шаркова было даручана знішчыць зенітныя кропкі на аэрадроме Сціш, на поўдзень ад Арла. Самалёт Шаркова ўзляцеў у цемры. Яму ўдалося прымусіць замаўчаць варожую зенітную батарэю. Тым часам асноўная група наблізілася да аэрадрома. Наляцелі так нечакана, што фашысты не паспелі нават пагасіць пасадачныя агні, запаленыя для прыёму сваіх самалётаў. У гэтым баі Шаркову ўдалося падбіць 2 самалёты і разбурыць службовы будынак. За мужнасць і адвагу, праяўленыя падчас знішчэння ўмацаванняў, тэхнікі і жывой сілы ворага ў Арлоўска-Курскай аперацыі, камандзір звяна Шаркоў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.**

**У баях пры фарсіраванні Дняпра Шаркоў зрабіў 10 баявых вылетаў. 15 кастрычніка 1943 года ён вадзіў групу “Ілаў” на штурмоўку войскаў праціўніка на правым беразе ракі ў раёне сяла Бабовічы.Група Іл-2 абрынулася на гітлераўцаў. На працягу 25-і хвілін лётчыкі трымалі праціўніка пад бесперапынным агнём, а нашы наземныя часці атрымалі магчымасць фарсіраваць Днепр і заняць шэраг апорных пунктаў. За ўдзел у Сеўскай, Гомельскай, Мазырскай аперацыях, актыўнае садзейнічанне нашым наземным войскам пры фарсіраванні Дняпра і ўтрыманне плацдарма на**

**правым беразе Шаркоў быў узнагароджаны другім ордэнам Чырвонага Сцяга.**

**Да жніўня 1944 года намеснік камандзіра эскадрыллі 218-га штурмавога авіяцыйнага палка старэйшы лейтэнант В. І. Шаркоў здзейсніў 93 баявых вылеты, знішчыў значную колькасць баявой тэхнікі і жывой сілы праціўніка і быў прадстаўлены да вышэйшай узнагароды краіны. 23 лютага 1945 года за мужнасць і воінскую доблесць, праяўленыя ў баях з ворагам, удастоены звання Героя Савецкага Саюза.**

**За баявыя заслугі узнагароджаны ордэнамі: Леніна, Чырвонага Сцяга (двойчы), Айчыннай вайны 2-й ступені, Чырвонай Зоркі; медалямі.**

**Кмаю 1945 года здзейсніў 109 баявых вылетаў, знішчыў 11 самалётаў, 2 эшалоны, 12 танкаў, 5 артылерыйскіх батарэй, 20 зенітных кропак, 70 аўтамашын, 3 склады з боепрыпасамі і шмат іншай тэхнікі.Апошнія месяцы Вялікай Айчыннай вайны Шаркоў правёў у бесперапынных баявых вылетах на Варшаўскім, а затым на Берлінскім напрамках.**

**Пасля вайны працягваў служыць у ВВС. У 1946 годзе па стане здароўя звольніўся ў запас. З 1948 года служыў у органах дзяржаўнай бяспекі. З 1963 года падпалкоўнік В. І. Шаркоў - у запасе. Жыў у Маскве. Памёр 28 красавіка 1983 года.Пахаваны на Ваганькаўскіх могілках.Устаноўлены помнік Герою**

**і на “Алеі Герояў” у г.Асіповічы Магілёўскай вобласці.**

## ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ

**У час Беларускага аперацыі 1944 года старэйшы лейтэнант Шаркоў быў намеснікам камандзіра 1-й эскадрыллі 218-га штурмавога авіяцыйнага палка.У чэрвені 1944 года адважны афіцэр прымаў актыўны ўдзел у штурме войскаў праціўніка ў раёне Бабруйска, Асіповічаў, Слуцка.**

**24 чэрвеня 1944 ён падняўся ў свой 85-й баявывылет, узначальваючы васьмёрку “Ілаў”, якія накіроўваліся для ўдару па камунікацыях ворага на паўднёвы захад ад Жлобіна. Яшчэ на падыходзе да мэты скрозь заслону ранішняга туману лётчыкі ўбачылі далёка расцягнуўшуюся калону цяжкіх варожых танкаў, бронемашын, запраўшчыкаў гаручага і грузавых аўтамашын, крытых брызентам. Павярнуўшы направа, штурмавікі імкліва набліжаліся да калоны. Немцы сустрэлі іх загараджальным агнём зенітнай артылерыі.**

**Прарываючыся скрозь гэтую агнявую заслону, Шаркоў вывеў групу ў правым пеленге на цэль: так саперніку было цяжэй прыстрэльвацца да “Ілаў”. Шаркоў аддаў прыказ атакаваць фашыстаў і сам накіраваў машыну на калону праціўніка.Услед**

за Шарковым на калону накіраваліся астатнія. У суцэльным воблаку зенітных разрываў штурмавікі несліся насустрач зямлі. Пасля першай атакі запалалі 2 танкі і бронетранспарцёр праціўніка. Добра бачна былі языкі полымя, густы чорны дым. Рух на дарозе затармазіўся. Немцы ў паніцы замітусіліся, кідаючы тэхніку.

- Другі заход! - распарадзіўся камандзір групы. Цяпер агонь рэактыўных снарадаў, гармат і кулямётаў абрынуўся на хвост калоны. І на 3 – 4-м заходах штурмавікі працягвалі граміць тэхніку ворага. Бартавая зброя працавала безадказна. Пры абстрэле крытыя брызентам аўтамашыны ўзрываліся: відаць, везлі боепрыпасы. Больш за 20 хвілін варожая калона падвяргалася ўдарам нашых штурмовікоў, на дарозе з'яўляліся новыя і новыя клубы дыму.

Калі група "Ілаў", зрабіўшы апошні, 5-ы заход, стала адыходзіць ад цэлі, на дарозе і яе ўзбочынах Шаркоў налічыў больш за два дзясяткі ачагоў полымя, некалькі падбітых танкаў, машын, штабных аўтобусаў. Было забіта шмат нямецкіх салдат. А галоўнае - нашым самалётам удалося надоўга паралізаваць рух немцаў на важнай магістралі.

У той дзень Валянцін Іванавіч, узначальваючы групы "Ілаў", здзейсніў яшчэ 4 баявых вылеты, выконваючы па 5 - 6 заходаў на пазіцыі акружанай

фашысцкай дывізіі. За эфектыўныя штурмавыя ўдары Шаркоў быў узнагароджаны другім ордэнам Чырвонага Сцяга. У прадстаўленні да ўзнагароды гаварылася: “Важнай рысай характару Шаркова з’яўляецца ўпартасць у дасягненні мэты, смеласць, адвага, стрыманасць і цвярозы разлік. У складанай абстаноўцы дзейнічае ўмела. Над полем бою праяўляе разумную ініцыятыву і знаходлівасць, мужнасць. З выключнай настойлівасцю выконвае баявыя заданні”.

Шмат разоў яшчэ прыходзілася Шаркову вадзіць групы самалётаў Іл-2 на штурмоўку мотамеханізаваных калон, жывой сілы, артылерыйскіх і мінамётных пазіцый, складоў, чыгуначных воінскіх эшалонаў, станцый, апорных пунктаў і аэрадромаў праціўніка. І хоць ворагі 5 разоў збівалі адважнага штурмавіка: 3 разы зeніткі і 2 - знішчальнікі, Шаркоў заставаўся цэлым, вяртаўся на аэрадром, сядаў на іншы самалёт і зноў падымаўся ў паветра, каб з яшчэ большай лютасцю граміць захопнікаў.

У наступальных баях у Беларусі старшы лейтэнант Шаркоў зрабіў 21 баявы вылет.


ВЫВОД:
ГЕРОЯ СОВЕТСКОГО СОЮЗА".
/ЛЫСЕНКО/
1944 года.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 23 лютага 1945 года за ўзорнае выкананне заданняў камандавання і праяўленыя мужнасць і гераізм у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі старэйшаму лейтэнанту Шаркову Валянціну Іванавічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медалі “Залатая Зорка”.



# ЛІТАРАТУРА:


1. Шаркоў, В.І.: Героі Савецкага Саюза, якія вызначыліся ў баях пры вызваленні г.Асіповічы і Асіповіцкага раёна // Запаветы Леніна. – 1994. – 25 чэрвеня.

2. Шарков Валентин Иванович – Герой Советского Союза, участвовал в штурме войск противника в районе г.Осиповичи // Навечно в сердце народном. -- Мн., 1984. -- С.580.
3. Шарков В.И. // Герои Советского Союза : краткий биограф.словарь. В 2т. Т.2. -- Мн., 1987. -- С.760.
4. Шарков Валентин Иванович[Электронный ресурс] / Герои страны : интернет проект. – Минск, 2000-2013. – Режим доступа :http://www.warheroes.ru
5. Шарков Валентин Васильевич/ Электронный банк документов «Подвиг народа в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг. – Режим доступа :http://www.podvignaroda.mil.ru